# Прэзентацыя кнігі Леаніда Лаўрэша ў Гародні





30 траўня ў зале пасяджанняў Гарадзенскай абласной бібліятэкі імя Я. Карскага (Новы замак) адбылася прэзентацыя кнігі "Грэка-каталіцкая (уніяцкая) Царква на Лідчыне". Аўтар - вядомы лідскі краязнаўца Леанід Лаўрэш.

Прысутнічалі студэнты IV курса факультэта гісторыі і сацыялогіі, якія праходзяць спецыялізацыю "Хрысціянства ў гістарычным лёсе беларускага народа" (канец X - пачатак XX ст.)", а таксама магістранты і аспіранты работнікі абласной бібліятэкі, краязнаўцы Гародні, прадстаўнікі Гарадзенскай грэка-каталіцкай грамады імя св. Язафата на чале з айцом Андрэем і прадстаўнікі прэсы.

Вёў паседжанне дацэнт кафедры гісторыі Беларусі ГрДУ імя Я. Купалы, кандыдат гістарычных навук Загідулін А.М. Адкрыла прэзентацыю намеснік дырэктара Гарадзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я. Карскага Ігнатовіч М.Э. Выступілі Загідулін А.М., Лаўрэш Л.Л., доктар гістарычных навук, прафесар С.В. Марозава, айцец А. Крот. Выступоўцы адзначалі, што "Леанід Лаўрэш - вядомы на Гарадзеншчыне краязнавец, улюбёны ў гісторыю свайго краю. Сваімі даследаваннямі Лідчыны ён уносіць важныя штрыхі ў нашы веды пра гісторыю заходняга рэгіёна Беларусі, вяртае з нябыцця незаслужана забытыя імёны ўраджэнцаў Гарадзеншчыны - вучоных, дзеячаў навукі і культуры, прадстаўнікоў мясцовай адміністрацыі і духавенства, удзельнікаў грамадскіх рухаў і сацыяльных выбухаў. Пяру Лаўрэша належаць тры кнігі і сем дзесяткаў артыкулаў. Усе яны грунтуюцца выключна на матэрыяле гістарычных крыніц. Кафедру гісторыі Беларусі звязве з лідскім краязнаўцам даўняе сяброўства і супрацоўніцтва. Леанід Лаўрэш - удзельнік шэрагу нашых навуковых канферэнцый і аўтар навуковых зборнікаў. Ён з'яўляецца заснавальнікам і адміністратарам сайта Pawet - першага ў Беларусі гістарычнага сайта. Гэты сайт назапасіў багацейшыя інфармацыйныя рэсурсы па гісторыі Лідчыны, Гарадзеншчыны, Беларусі і ўжо больш за дзесяцігоддзе служыць гістарычнай навуцы, краязнаўству, адукацыі і асвеце. Штодня гэтымі рэсурсамі карыстаюцца звыш адной тысячы ўнікальных наведвальнікаў.

Шэраг прац краязнаўца прадстаўлены на выставе, якую падрыхтавала бібліятэка.

Пры абмеркаванні кнігі выступілі студэнты ўніверсітэта Вераніка Кузьміч, Павел Токць, Ірына Ракоўская, гарадзенскія краязнаўцы і проста прысутныя.

***Наш кар.***

***На здымках:*** 1. Падчас прэзентацыі; 2. Л. Лаўрэш, С. Марозава, айцец Андрэй, А. Загідулін.